## Гонар і слава Міншчыны

# ЁН ЛЮБІЎ НАШ КРАЙ

### Да 100-годдзя з дня нараджэння В.І. Казлова



**У гістарычным календары нашай вобласці дата 18 лютага асаблівая. Якраз у гэты дзень сёлета спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння Васіля Казлова — чалавека, які лічыў Міншчыну сваёй другой малой радзімай і аддаў ёй лепшыя гады жыцця, кіраўніка, які, нават знаходзячыся на высокіх дзяржаўных пасадах колішніх Беларускай ССР і Савецкага Саюза, ніколі не забываў пра наш прысталічны рэгіён і заўсёды адстойваў яго інтарэсы.**

**Нецярпліва-занятаму чытачу, які ўсё ж захоча даведацца пра жыццёвы шлях і рэгаліі В. Казлова, параю звярнуцца да лаканічна-скупых звестак пра гэтага чалавека ў энцыклапедыях, астатніх жа запрашаю на сустрэчу з дачкой Васіля Іванавіча – кандыдатам філалагічных навук, дацэнтам Белдзяржуніверсітэтам, заслужаным работнікам вышэйшай школы Беларусі Вольгай Васільеўнай Казловай.**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## ВЫПРАБАВАННЕ УНІВЕРСІТЭТАМ

Вольга Васільеўна — мой універсітэцкі выкладчык. Таму мне ўдвая было прыемна слухаць яе расказ. Бо з кожным новым эпізодам з жыцця яе бацькі па-свойму цікавай і больш зразумелай станавілася і яна сама — чалавек, якому я абавязаны такім-сякім пазнаннем беларускай літаратуры і, у прыватнасці, жыццяпісу свайго знакамітага земляка Якуба Коласа, творчасць якога — асноўны напрамак у навуковых даследаваннях маёй суразмоўцы.

— А Васілю Іванавічу на першым часе навука лёгка не давалася, — распытаўшы пра гады майго студэнцтва, зазначыла Вольга Васільеўна. — Аднак ён дзякуючы сваёй настойлівасці і вытрымцы заўсёды дасягаў таго, да чаго імкнуўся. Дарэчы, менавіта з вучобай бацькі ў памяці адклаліся і мае першыя ўражанні аб ім.

У 1930 годзе наша сям'я прыехала ў Мінск, бо тату накіравалі на вучобу ў галоўную на той час партыйную навучальную ўстанову Беларусі — Камуністычны універсітэт. Мы жылі ў цесным інтэрнацкім пакої. І калі вечарамі тата "браўся за ўрокі", мяне, шасцігадовае дзяўчо, каб не перашкаджала, усаджвалі пад стол. Там былі нейкія цацкі, і ў гульні з імі я знаходзіла сабе занятак. А ў той жа самы час "зверху" ўголас настойліва бацькам штудзіраваліся працы класікаў марксізму-ленінізму. Таму пазней, у студэнцкія гады, у мяне на занятках па філасофіі, палітэканоміі і гісторыі Кампартыі амаль не было ніякіх праблем — многія цытаты з праграмных прац У. Леніна, К. Маркса і іншых дзеячаў міжнароднага пралетарскага руху былі мне ўжо крыху знаёмы, і гэтыя творы, пасля пэўнага паўтарэння, засвойваліся мною вельмі лёгка...

"Выпрабаванне універсітэтам" на жыццёвым шляху Васіля Іванавіча было не першым. Яшчэ будучы падлеткам, ён цвёрда для сябе ўсвядоміў: нішто ў гэтым свеце не даецца задарма, і асабліва простаму селяніну. У невялікай вёсцы Заграддзе, што на Жлобіншчыне, сям'я Казловых нічым асаблівым не вылучалася. Так, як яны, жылі на той час практычна ўсе: малазямелле не спрыяла дастатку. Таму ў 14 год, маючы за плячыма толькі чатыры класы царкоўнапрыходскай школы, Васіль адважыўся "пайсці ў людзі" і паспытаць свайго шчасця ў якасці рабочага. Але па прычыне малых год нідзе

*З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы*